# Вечарына “Паларожжа ў родную мову”

Мерапрыемства прысвечанае Міжнароднаму дню роднай мовы

**Л. Р. Валуевіч,**
бібліятэкар першай катэгорыі
Хатыніцкай СШ Ганцавіцкага раёна

Родная мова.
З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор’яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, –
Ты выткана, дзіўная родная мова.
Няма на зямлі таго шчасця і гора,
Якога ты нам перадаць не магла,
Няма такіх нетраў, глыбокага мора
І гор, праз якія б ты не правяла
Мяне на радзіму, туды, дзе сягоння
Стаіць акрываўлены вораг з пятлёй
Над спаленай хатай, над родным загонам,
Над будучыняй і над песняй маёй, –
Над тым, што было і што век будзе вольным.
Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім
Праз цемру і годы змаганняў суровых.
Калі ж ападзе і развеецца дым
І нівы васкросшыя закаласяцца, –
Ізноў прашуміш ты вясновым дажджом,
Ізноў зазвініш ты ў кожнай у хаце,
Цымбалам дасі іх сярэбраны гром
І вусны расквеціш усмешкай дзіцяці.
(М. Танк)

**1 вядучы:** Сапраўды, родная мова ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці. Прыгожае яе гучанне мы пачынаем успрымаць з матчыных песень,цудоўных народных казак,легенд, паданняў. З роднай мовай мы пакідаем бацькоўскі

парог, выпраўляючыся ў далёкія вандраванні. І пачуццё радзімы,якое неяк губляецца, калі ўвесь час жывеш на гэтай зямлі, асабліва абвастраецца, калі апынешся дзесьці далёка. Тады з любоўю ўспамінаецца кожны куточак роднай старонкі, яе людзі, асабліва мілагучнай здаецца мова.
**2 вядучы:** Родная мова непарыўна звязана з думкамі, пачуццямі чалавека. Праз яе ён спасцігае свет і выказвае сябе. На роднай мове, закладзенай не толькі ў свядомасці, але і ў сэрцы, чалавек сцвярджаецца як унікальная асоба. Вось чаму так важна захоўваць моўную і культурную разнастайнасць у свеце. З гэтай мэтай у 1999 годзе ЮНЕСКА аб'явіла 21лютага Міжнародным днём роднай мовы.

**1 вядучы:**У наш час агульная колькасць моў дакладна не вызначана з –за неакрэсленасці межаў паміж мовамі і дыялектамі, недастатковай вывучанасці некаторых моўных рэгіёнаў.

Лічыцца, што жывых моў у свеце ад 3 да 5 тысяч і ад 6 да 8 тысяч дыялектаў.
**2 вядучы**: Сёння на зямлі жыве больш за 300 народаў, колькасць якіх па асобку перавышае 1 мільён чалавек. Сярод моў 18 маюць больш за 50 мільёнаў носьбітаў (кітайская, іспанская, англійская, руская і інш.). Славянская мова – пятая па распаўсюджанасці на планеце група моў. На ёй гавораць больш за 300 мільёнаў чалавек.
**Гучыць ціха беларуская народная музыка. Вучні чытаюць верш П,Броўкі "Калі ласка"**
**Юнак:**У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: "Калі ласка!"..
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць сам мною.
**Дзяўчынка:** Трапіць госць у будзень, а ці у свята:
- Калі ласка, калі ласка ў хату!
Не паспелі сесці пры сустрэчы,
Як патэльня засквірчала ў печы,
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце,людцы, калі ласка!
**Юнак:**Хлопец кажа дарагой дзяўчыне:
- Калі ласка, будзеш гаспадыняй!
Эх,жыццё збудуем мы прыгожа,
Усе з табой нягоды пераможам.
**Дзяўчына:** Гром грыміць з нябесамі размова:
- Калі ласка, цёплы дождж вясновы!
І не вельмі буйны, і не рэдкі –
На сады, на пушчы, на палеткі,
На грыбы, на ягады , на кветкі…
**Юнак:-** Калі ласка,! – наш зварот бясконцы.
Мы гаворым ранішняму сонцу:
Радасцю аблашчы нашы твары,

Ты ўзнімі з сабою нашы мары!
**Дзяўчына:** Калі ласка!.. – нашай роднай мовы
Шчырыя і ветлівыя словы.

**1вядучы:**Гэтымі роднымі, шчырымі і ласкавымі словамі запрашаем вас, дарагія вучні і настаўнікі, на вечарыну “Падарожжа ў родную мову”.

**2 вядучы**: Сто гадоў шукай другой красы,
А тым больш, што свет зусім не вузкі.
Ды калі ты не бязродны сын,
Гавары са мной па-беларуску.(Я. Янішчыц)

**1Чытальнік:** Я – беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Ад веку прашчуры жылі.
Я – беларус, я ганаруся,
Што маю гэткае імя.
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма.
Я – беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здаля. (Ніл Гілевіч)

**2 чытальнік**: Сябра мой, любі свой край!
Бераг, рэчку, поле,гай.
Любі лес, любі рамонкі,
Птушак звонкія гамонкі,
Мовай роднай ганарыся,
Працаваць ты не ляніся.
З хлебам будзе хай абрус,
Помні, што ты – беларус.

**Гучыць песня “Беларусачка” ў выкананні вучняў**

**1 вядучы:**Родная беларуская песня… Яна бывае тужлівая і вяссёлая, бадзёрая і самотная, ад яе хочацца плакаць і хочацца радавацца…

У народнай песні адлюстравалася само жыццё з яго радасцямі і нягодамі,з марамі і спадзяваннямі, з вялікімі пачуццямі.Менавіта народная песня з’яўляецца крыніцай, адкуль мы чэрпаем роднае слова прыгожае, мілагучнае,ласкавае.

**Група вучняў выконвае беларускую песню “Люблю наш край старонку гэту”**

**ЛЮБЛЮ НАШ КРАЙ**

Люблю наш край, старонку гэту,
Дзе я радзілася і расла,
Дзе ў першы раз пазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.
Дзе ў першы раз пазнала шчасце,

Слязу нядолі праліла.
Люблю народ наш беларускі
І хаты ў зелені садоў,
Заложаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў.
Заложаныя збожжам нібы,
Шум нашых гаяў і лясоў.

І песню родную люблю я,
Што дзеўкі ў полі запяюць
І словы звонкія над нівай
Пераліваюцца, плывуць.
І словы звонкія над нівай
Пераліваюцца, плывуць.

І усё люблю я, што завецца
Адзіным словам – Беларусь,
І слова гэтага святога
Ніколі ў свеце не зракусь.
І слова гэтага святога
Ніколі ў свеце не зракусь.

**2 вядучы:** У нашай краіне, а таксама ў нашай мясцовасці заўсёды так было: дзе спявалі, там і танчылі.

**Прапануем вашай увазе беларускі танец "Бульба".**

**2 вядучы:** У кожнага чалавека, дзе б ён ні жыў, есць родная мова, якая нястомна служыць у розных яго занятках і патрэбах. Сіла і краса народнага слова – заканамерны вынік моватворнай дзейнасці народа. Нашы продкі тонка адчувалі слова, умелі зазірнуць у яго глыбіні.

**1 вядучы:** Кожны з нас – своеасаблівая і непаўторная індывідуальнасць, хоць, здаецца, існуе шмат падобных людзей. І ўсё – такі знешнасць, пастава, манера апранацца ў кожнага свая, тое ж самае можна сказаць пра нашу мову і маўленне.

**2 вядучы:** Уявіце сабе, што мы з вамі апынуліся ў час непісьменнасці.

Ці ведаеце вы, дзеці, што такое піктаграфія?

Піктаграфія (ад лац. піктус – намаляваны і грапхо – пішу) – старажытны тып пісьма.

Піктаграфічныя знакі (піктаграмы) уяўлялі з сябе малюнкі, якія наглядна адлюстроўвалі рэчаіснасць (напрыклад, чалавека, жывёл, дрэвы, сцэны палявання і інш). Такія малюнкі вобразна перадавалі змест, не былі звязаны з алфавітам, лёгка "чыталіся".

Такая сістэма зносін паміж людзьмі існавала да таго часу, пакуль не з'явілася пісьменнасць.

**Чытальнік:** Па – рознаму людзі
Прыходзяць на свет.
Адных – знойдуць
У агародзе, ці ў красках,
Другіх – прынясе
Бусел наш дамасе,
Але ўсіх гадуюць нас
Матчыны казкі.
Яны вучаць
Родную мову любіць,
На крылах юнацтва
Уздымацца пад хмары,
З няпраўдай змагацца,
А з праўдай дружыць
І аб недасяжным
І сонечным марыць.
Таму на сваіх я
Шляхах бы юнацкіх
Паставіў бы помнікі
Матчыным казкам. (М. Танк)

**1 вядучы: А зараз вашай увазе казачны твор “Чароўны куфэрак”**

**Царыца Мова з дочкамі збіраюцца на баль да каралевы Гісторыі, складаюць падарункі.**

**Царыца Мова.** Хутка пачнецца баль у каралевы Гісторыі. Глядзіце ж , дачушкі, каб падабралі падарункі годныя. Каралева Гісторыя ганарыстая, наравістая, ніхто ёй не можа дагадзіць. Трэба пастарацца ўлагодзіць Яе Вялікасць.Ды і гасцей запрасілі з усяго свету. Апранайце найпрыгажэйшыя сукенкі, выбірайце найдаражэйшыя падарункі. Баль хутка пачнецца.

**Мова Французкая (любуючыся сабой у люстэрку).** Мяне абавязкова заўважаць у каралеўскім двары. Я прывязу у палац багата слоў, з дапамогай якіх можна расказаць пра моду і касметыку. Які яшчэ трэба падарунак!

**Мова Англійская (гарачыцца, перабівае сястру).** А я? Ці ж я горшая? Ды без мяне… Што рабілі б без мяне тыя, хто працуе на камп’ютары? Ого, мяне ведаюць у многіх краінах свету. Я завязу каралеве ў падарунак электронны слоўнік на англійскай мове.

**Мова Руская (ганарліва).** А я такая таленавітая! О-О-О! Пра мяне яе вялікасць Гісторыя абавязкова ведае. Я ёй падару тамы Пушкіна, Лермантава, Гогаля, Талстога…

(збірае ў падарунак кнігі).

**Мова Беларуская (сціпла стаіць у баку, самліва апусціўшы вочы; разважае пра сябе).** Што ж падарыць каралеве Гісторыі? Можа мне зусім не трэба ехаць на гэты баль?

Сёстрам вунь колькі гадоў, а я ж толькі-толькі пачала выходзіць у свет.

Але ж як хочацца на гэты баль! Як трапечацца маё беднае сэрцайка ў прадчуванні чагосьці новага, цікавага… А як хочацца ўбачыць яе вялікасць

Гісторыю… Хоць адным вочкам… Толькі вось як з падарункам быць? Адзін мой скарб – вось гэты куфэрак. Толькі ці спадабаецца ён Яе Вялікасці? Хай будзе, што будзе. Паеду! **(Рашуча складае у куфэрак кнігі - падарункі).**

**Царыца Мова і яе дочкі пакідаюць пакой**

**Дзея другая**

**Баль у палацы каралевы Гісторыі. Адзін за другім да яе вялікасці, што сядзіць на троне, падыходзяць госці, схіляюцца ў нізкім паклоне перад важнай Гісторыяй, падносяць свае дары. Прыйшла чарга царыцы Мовы і яе дачушак.Дочкі падносяць свае падарункі. Надышла чарга Мовы Беларускай. Сціплая, сарамлівая, яна нясмела падышла да важнай асобы і паставіла перад ёй невялікі куфэрак.**

**Каралева Гісторыя** (ажно падскочыла на сваім троне гнеўна). Ах, ты, нягодніца, як жа ты адважылася прынесці мне такі нязначны падарунак! Ты толькі паглядзі, што мне іншыя прынеслі ў дар!

**Мова Беларуская**. Матухна Гісторыя! Не гневайся на мяне! Я сабрала ў гэты куфэрачак усё самае каштоўнае, што ў мяне ёсць.

**Каралева Гісторыя (з насмешкай у голасе).** Што ж у цябе такое каштоўнае тут пакладзена? Пакажы нам сваё багацце.

**Беларуская мова.** Тут у мяне – песні беларускія: купальскія,жніўныя, вясельныя, хрэсьбінныя …Адны песні вясёлыя, жартоўныя**… (гучыць мелодыя вясёлай народнай песні).** Другія песні за сэрца кранаюць, душу вярэдзяць**… (гучыць мелодыя сумнай народнай песні**

**Гаворыць больш упэўнена,бярэ з куфэрка зборнікі беларускіх прыказак.**

А яшчэ ў маім куфэрку – прыказкі , мудрасць народная! Колькі ж у іх павучальнага сэнсу! Школа жыцця ,не назавеш інакш:

Не хвалі сябе – няхай людзі пахваляць.

Выказанага слова да губы не вернеш.

Дзе розумам не дойдзеш, дык у кніжцы знойдзеш.

Дзе справа, там і слава.

Людзей слухай, ды свій розум май.

**Гаворыць смела, выбірае з куфэрка кнігі беларускіх аўтараў**

А гэта ж сапраўдны скарб – вершы таленавітых беларускіх паэтаў. Талент ад Бога – у Францішка Багушэвіча. Нашаптаныя хлебнай ніўкай радочкі вершаў Якуба Коласа. Непаўторны голас “ Жалейкі” Янкі Купалы.Богам дадзенае слоўка – у “Вянку” Максіма Багдановіча. Вось яно,жыццё народнае,у творах Цёткі – мудрай Цётачкі! Пра гора, бяду – у радках Бядулі ды Гаруна. Незвычайную сілу мае беларускае слоўка: гучыць то як песня салоўкі ў вясновым надрэччы, то як смех свавольных ручайкоў, то як шолах восеньскай залатой лістоты, то як самотная песня зімовай завеі.

**Голас за сцэнай чытае верш Аляксея Зарыцкага**

1.Мова

Пявучая родная мова,
Ты – уладарка нявызнанных скарбаў.
Столькі значэнняў, гучанняў і фарбаў

Мае ў сабе тваё кожнае слова.
2.Іншае слова напоўнена плёскам
Хвалі дняпроўскай,
Іншае слова такое,
Што рэха лясное
У яго глыбінях затоена
3.Ёсць і як мёд залатое, густое,
На травах яно духмяных настоена.
Ціха гучаць у мове маёй
Словы пяшчотныя,
Словы крынічныя,
Росныя.
4.Чуецца ў ёй –
І грымотныя,
Зычныя.
Водгулле бітваў грознае.
5.Часам бывае – заззяе неспадзявана
Новаю зоркаю слова – абнова.
Колькі ў табе невызнаных скарбаў схавана,
Мова мая,
Пявучая родная мова.

**Знікла здзеклівая усмешка з вуснаў ганарыстай Гісторыі. Прыціхлі госці, зачараваныя незвычайнай сілай беларускага слова. І калі зачынілася вечка чароўнага куфэрка, неяк пацяплелі вочы каралевы, палагаднелі сэрцы багатых гасцей**

**Госць першы.** Не, вы толькі паглядзіце, маладая ж яшчэ зусім гэта Мова Беларуская,а якая таленавітая.

**Госць другі.** Так-так,браце, а прыгожая якая, мілагучная, напеўная, чыстая,гарачая.

**Госць трэці.** Ды, відаць працавітая. Вунь колькі здабыткаў мае!

**Госць чацвёрты**. О-о-о, гэта мова далёка пойдзе, пра яе мы яшчэ пачуем.

**Каралева Гісторыя.**Адкрываю, як свет, нанова
Беларускае роднае слова,
пералівістае – як каменьчык,
вясёлкавае – як ручэй,
цёплае – як агеньчык
добрых тваіх вачэй,
светлае – як маланка,
гнеўнае – як пярун,
ціхае – як калыханка,
вечнае – як Беларусь!
(Урывак з верша Анатоля Канапелькі)

Даруй мне, Мова Беларуская, што была пагарджанаю, што была занятбанаю.Я веру ў тваю светлую будучыню. Сама гісторыя штурхае на прызнанне, на павагу, на захапленне багаццем і прыгажосцю беларускай

мовы. І нават  тыя, што адышлі ад яе, рана ці позна вяртаюцца да звонкага “дзе” і густога  “чаго”.

**2 вядучы**: Вось і падышла да канца наша вандроўка па Краіне роднай беларускай мовы. Але кожны з вас гэтае падарожжа можа працягваць сам, звяртаючыся да роднага слова, да роднай песні, казкі, кніг беларускіх пісьменнікаў. Хачу пажадаць вам як мага больш  сустрэч з беларускім словам і назаўжды запомніць заклік Ніла Гілевіча.

**1 вядучы**: Прайдзіся па школах – у Мінску, у Гродна,
У Віцебску, Брэсце або Магілёве, –
Як хораша дзеткі шчабечуць на роднай
Сваёй беларускай матульчынай мове!
**Дзяўчынка:**У кожным тэатры і з кожнай трыбуны
Я чую пявучыя, мілыя гукі.
Ад сэрца да сэрца – ці свята, ці будні –
Ідзе мая мова, ідзе без прынукі.
**Юнак**: І так па-дзяржаўнаму смела і горда
Трымаецца ўсюды, што часам міжволі
Гарачая хваля падступіць да горла
І слёзы ад шчасця не знаюць патолі.
**Усе (разам)**
Дык жыві і квітней, маё роднае слова.